## № 85. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*18 студзеня 1935*

Любыя мая Анечка, Лорачка і Лялячка!

Што–ж гэта ад Вас ніякіх вестак няма? Ніводная з Вас ні слова не напісала за гэту шасьцідзёнку. Нядобра гэтак.

Гэтымі днямі вызываў мяне, як і іншых, да сябе шэф, як ён сам сябе рэкамэндаваў. Вот я ў яго і пытаўся наконт лёсу свае заявы пра пераезд у Слабадзкі. Нічога пэўнага, аднак, ён не адказаў. Заявы, кажа, ня бачыў. Дакляраваў адшукаць і далажыць начальніку. На маё пытаньне, ці можна спадзявацца на станоўчае вырашэньне гэтага пытаньня, ён сказаў, што ўсё залежыць ад начальніка, адным словам, ухіліўся ад пэўнага адказу.

Уражаньне ў мяне стварылася такое, што наўрад ці можна спадзявацца на дазвол, хоць, калі судзіць па яго прапановах і іншым падаваць заявы на пераезд, ня выключана магчымасьць для некаторых атрымаць пераводы ў іншыя месцы. Дакляраваў праз дзён пяць даць адказ, калі гэты адказ будзе станоўчым, і ня даць ніякага, калі будзе ён адмоўным.

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 86. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*20 студзеня 1935 г.*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Сёньня атрымаў Ваш ліст. Вельмі–ж слаўна напісала Лорачка. Такі харошы ліст! Я вельмі цешыўся ім і радаваўся, што такая ў нас слаўная і разумная дачанька. Напішу табе, Лорачка, асобны ліст. Сёньня–ж мне хочацца пераведаць Вас гэтай лістоўкай. Чаму–ж гэта Лялячка нічога не напісала? Ты–ж, Ляля, мусіць, у сад цяпер ня ходзіш, дык часу ў цябе многа, магла–б свайму бацiку і ліст напісаць ды расказаць, як гуляеш, што чытаеш, як маюцца твае зюські і бусьскі. Пра ўсё гэта мне напішы, Ляля. Анечка, адказу ад шэфаў яшчэ не атрымаў. Тымчасам з гадавой справаздачаю падыходзім к канцу. Магчыма, к чыслу 26 закончым зусім. Вот тады высьветліцца і маё становішча ў крайгорце. Пакуль што адданы загад, у якім пералічаюцца пэрсанальна супрацоўнікі нашай бухгальтэрыі, якія пераводзяцца пасьля заканчэньня справаздачы ў гандлёвую базу крайгорта. У тым ліку і я. Наконт акладаў яшчэ дакладна не сказана. Напісана толькі „з раней устаноўленымі акладамі“. Як разумець гэта, так ніхто яшчэ і ня ведае. Калі гэта маюцца на ўвазе аклады, устаноўленыя па крайгорту, дык можна чакаць павелічэньня да 300 ці нават 350. Радзівонаў гаварыў, што гэта аклады, устаноўленыя для крайгорта, маюцца на ўвазе у загадзе пра нас.

Калі–б так, дык гэта нядрэнна было–б. Праўда, праца ў гандлёвым аддзеле ня вельмі прыемная. Але, зрэшты, праца ўсюды праца. Я думаю, калі мне прапануюць таварную частку з акладам 350, дык і даць згоду. Зразумела, што ў тым выпадку, калі ад шэфаў прыдзе адмоўны адказ. У выпадку станоўчага адказу я зайду ў крайано і паспрабую атрымаць назначэньне ў тэхнікум. Бывайце здаровы. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.